## Еўрапейская палітыка суседства і праграма “Ўсходняе партнёрства”: агульнае і адрознае

Ініцыятыва “Ўсходняга партнёрства” была распрацаваная ў рамках Еўрапейскай палітыкі суседства і закліканая развіваць яе і замацоўваць. Аднак, нягледзячы на відавочную пераемнасць, новая праграма Еўразвязу мае і прынцыповыя адрозненні ад Еўрапейскай палітыкі суседства.

Праграма Еўразвязу “Ўсходняе партнёрства”, афіцыйны старт якой быў дадзены на нефармальным саміце ЕЗ у Празе 7 траўня 2009 г., не ўзнікла на пустым месцы. Яшчэ ў 1994 г. Еўразвяз падпісаў з Украінай і Малдовай Пагадненне аб партнёрстве і супрацоўніцтве, якім былі закладзеныя папярэднія асновы для вызначэння ўзаемаадносінаў з краінамі, якія ўзніклі на крушнях былога Савецкага Саюза. Але сапраўды актуальнай для Еўразвязу дадзеная праблема стала толькі пасля яго пашырэння ў траўні 2004 г. на ўсход за кошт былых сацыялістычных краін Сярэдняй Еўропы. За год да гэтай падзеі, у сакавіку 2003 г. Еўрапейская камісія распрацавала канцэпцыю Еўрапейскай палітыкі суседства (ЕПС), якая была выкладзена ў звароце Еўракамісіі “Шырокая Еўропа – суседства: новыя рамкі адносінаў з нашымі ўсходнімі і паўднёвымі суседзямі”. У гэтым звароце падкрэслівалася, што фармаванне адносінаў з суседзямі – адзін з прыярытэтаў вонкавай палітыкі пашыранага ЕЗ. Палітыка суседства прадугледжвала развіццё з суседнімі краінамі прывілеяваных адносін, збудаваных на ўзаемным прызнанні супольных каштоўнасцяў, вяршэнства права, належнага кіравання, забеспячэння правоў чалавека, прынцыпаў рынкавай эканомікі і ўстойлівага развіцця. Праз некалькі месяцаў, у ліпені 2003 г., быў таксама прадстаўлены дакумент, датычны пашырэння Праграмаў Суседства і новага фінансавага інструменту – Еўрапейскага інструменту суседства і партнёрства.

Ініцыятыва “Ўсходняга партнёрства” была распрацаваная ў рамках Еўрапейскай палітыкі суседства і закліканая развіваць яе і замацоўваць. Аднак, нягледзячы на відавочную пераемнасць, новая праграма Еўразвязу мае і прынцыповыя адрозненні ад Еўрапейскай палітыкі суседства. Галоўныя з іх – наступныя:

1) “Усходняе партнёрства” – больш гнуткі інструмент, бо не проста ахоплівае шэсць краін Усходняе Еўропы і Паўднёвага Каўказу, але і можа развівацца з улікам патрэбаў, магчымасцяў і дасягненняў кожнай з краін-партнёраў.

2) “Усходняе партнёрства” датычыць больш звязаных адна з адной групы краін, якія не з’яўляюцца сябрамі ЕЗ, але маюць падобныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя інтарэсы, звязаныя з постсавецкім мінулым. .

3) Ключавы аспект “Усходняга партнёрства” – дыферэнцыяцыя. Дакумент Еўрапейскай камісіі ад 3 снежня 2008 г. прадугледжвае, што прынцыповым з’яўляецца дыферэнцыянаваны падыход да кожнай краіны-партнёра, у залежнасці ад паспяховасці прасоўвання ўнутраных рэформаў і развіцця ўзаемаадносінаў з ЕЗ на шляху еўрапейскай інтэграцыі.

4) Ва “Ўсходнім партнёрстве” прадугледжваецца паступовае ўкладанне з усімі краінамі новых дамоўных рамак, г. зн. пагадненняў пра асацыяцыю, уключаючы пагадненні пра глыбокія і ўсеахопныя зоны свабоднага гандлю для тых краінаў, якія жадаюць і гатовыя браць на сябе адпаведныя далёкасяжныя абавязальніцтвы з ЕЗ. Кожная краіна-партнёр можа разлічваць на паглыбленне палітычнай інтэграцыі з ЕЗ.

5) “Усходняе партнёрства” прапануе як двухбаковыя, так і шматбаковыя фарматы для ўзмацнення супрацоўніцтва ва Ўсходняй Еўропе і на Паўночным Каўказе. Гэта значыць, што прадугледжваецца адначасовае захаванне дынамікі развіцця двухбаковых узаемаадносін паміж краінай-партнёрам і ЕЗ. Шматбаковы фармат дае магчымасць усім краінам-партнёрам і ЕЗ лепш зразумець сітуацыю ў рэгіёне і супольна вырашыць наяўныя рэгіянальныя праблемы і пытанні стабільнасці і бяспекі ў рэгіёне.

6) У адрозненне ад ЕПС, “Усходняе партнёрства” не абмяжоўваецца суседскімі ўзаемаадносінамі і мае на мэце спрыянне краінам-партнёрам у набліжэнні да стандартаў ЕЗ. Такая мэта дасягаецца шляхам рэалізацыі працэсаў інтэграцыі краіны-партнёра ў ЕЗ па асобных сферах: эканамічная інтэграцыя, энэргетычная інтэграцыя, набліжэнне рэгулятарных нормаў, прававая апраксімацыя, адміністрацыйнае рэфармаванне і інш.

7) “Усходняе партнёрства” прадугледжвае большае фінансаванне ў параўнанні з тым, якое давалася ў рамках ЕПС. Еўрапейская Рада зацвердзіла прапанову Еўрапейскай камісіі аб пашырэнні наяўнага пакету Ініцыятывы ЕПС на 350 млн еўра. Гэтыя сумы дапоўняць рэсурсы, выдзеленыя на 2010–2013 гады. У выніку такое аб’яднанне пабольшыць агульную грашовую суму, прызначаную на выкананне ініцыятываў “Усходняга партнёрства”, да 600 млн еўра.

8) “Усходняе партнёрства” прадугледжвае арганізацыйную структуру, хоць яна і не развітая да такога ўзроўню, як, напрыклад, у Саюзе для Міжземнамор’я. Сустрэчы кіраўнікоў або ўрадаў краін-удзельніц “Усходняга партнёрства” будуць праводзіцца кожныя два гады. “Усходняе партнёрства” таксама ўводзіць штогадовыя сустрэчы міністраў замежных справаў ЕЗ і краін-партнёраў, міністэрскія канферэнцыі ў асобных галінах, рэгулярныя сустрэчы па чатырох тэматычных платформах (“Дэмакратыя, належнае кіраванне і стабільнасць”, “Эканамічная інтэграцыя і ўзгадненне са стратэгіямі ЕЗ”, “Энергетычная бяспека”, “Кантакты паміж грамадзянамі”), а таксама працу калегіяў для падтрымкі працы платформаў у канкрэтных сферах, фармат і ўдзельнікі якіх павінны вызначацца адпаведна з патрэбамі.

Акрамя ўрадавых прадстаўнікоў і Еўрапейскай камісіі, прадугледжваецца таксама стварэнне Форуму грамадзянскай супольнасці “Ўсходняга партнёрства” з мэтаю ўсталявання кантактаў паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і спрыяння іхняму дыялогу з органамі дзяржаўнай улады. Акрамя таго, запланавана таксама развіццё міжпарламенцкага супрацоўніцтва ў рамках “EuroNest” як складовай часткі “Ўсходняга партнёрства”.

9) “Усходняе партнёрства” ўводзіць праграму комплекснага інстытуцыйнага развіцця (Comprehensive Institution-Building Programme), якая павінна засяродзіцца на ўдасканаленні адміністрацыйнай дзейнасці ва ўсіх адпаведных галінах шляхам выяўлення слабых месцаў праз правядзенне падрыхтоўкі, наданне тэхнічнай падтрымкі і дапамогі.

10) У рамках праграмы “Усходняе партнёрства” прадугледжваецца ўкладанне пактаў “мабільнасць і бяспека”, якія павінны спрыяць перасоўванню людзей. Гэта павінна здзяйсняцца шляхам прававога палягчэння паездак у ЕЗ з адначасовым павелічэннем намаганняў у кірунку пераадолення карупцыі, арганізаванай злачыннасці і нелегальнай міграцыі. Канчатковай мэтай у доўгатэрміновай перспектыве з’яўляецца дасягненне бязвізавага рэжыму перамяшчэння ў межах усіх краін-партнёраў.

11) “Усходняе партнёрства” надае значную ўвагу пытанням энергетычнай бяспекі ў краінах-партнёрах і ў ЕЗ і ўзмацняе супрацоўніцтва ў сферы дзейнасці ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і клімату. У энергетычным сегменце гэтая ініцыятыва прадугледжвае належныя змены заканадаўства, тэхнічную і нарматыўна-тэхналагічную адаптацыю энергетычнай прасторы 6-ці краін-партнёрак да еўрапейскай. Пытанні энергетычнай бяспекі могуць перайсці з нацыянальнага ўзроўню да шматнацыянальнага пад патранатам ЕЗ.

12) “Усходняе партнёрства” будзе спрыяць развіццю праграмаў, скіраваных на сацыяльна-эканамічнае развіццё краін-партнёраў, асабліва ў кірунку пераадолення вострых сацыяльна-эканамічных разыходжанняў паміж гэтымі краінамі. Прадугледжваецца таксама, што яно ўзмоцніць сацыяльна-культурныя кантакты.

***Ясь Лапатэцкі.***

## “Музычныя зазімкі” ў Лідзе





1 лістапада ў Лідзе адбыўся бардаўскі канцэрт “Музычныя зазімкі”. Выступалі Алесь Камоцкі, Зміцер Казлоўскі і Таццяна Беланогая. Музыкаў са сталіцы прымала ўтульная актавая зала музычнай школы.

Негледзячы на тое, што задоўга да канцэрту хуліганамі былі знішчаныя ўсе афішы, якія віселі ў горадзе, паслухаць добрыя беларускія спевы прыйшло каля 80 чалавек.

Спадарыня Таццяна праводзіла конкурсы ад “Будзьма!” і запыталася ў аўдыторыі “Якія ў вас асацыяцыі з беларускай культурай”... І была вельмі, амаль да слёз, ураджаная, калі зусім маленькая дзяўчынка сказала годна па-беларуску “ВІЛЬНЯ”...



Зміцер Казлоўскі, у сваю чаргу, парадаваў слухачоў моцным рокавым гучаннем яго творам, глыбокім філасофкім зместам.

А Алесь Камоцкі, які завяршаў вечарыну, спяваў сваю лірыку.

Ці спадабалася сустрэча лідзянам, можна меркаваць па тым, што пасля яе заканчэння некаторыя падыходзілі да музыкаў і прасілі паспяваць яшчэ. Нажаль, таго не дазваляў рагламент часу... Але Таццяна Беланогая ўсё ж такі заспявала песню “Балюча”...

Сустрэча ладзілася моладзевым крылом Лідскай гарадской арганізацыі ГА “ТБМ імя Ф. Скарыны” у межах кампаніі “Будзьма!”. І будзем спадзявацца, што беларускае слова “зазімкі” не будзе забытае.

***Наш кар.***

## Кал□ за адраджэнне мовы, чытай, спадарства, “Наша слова”!

Шаноўныя сябры, пачалася падпіска на першаеы паўгоддзе 2011 года. У каталогу інфармацыя пра газету знаходзіцца на ст. 74. Цана змянілася мала. На 2009 год газета мае добры рэдакцыйны партфель і плануе для друку тэксты самых розных матэрыялаў, з рознымі поглядамі і падыходамі, у тым ліку і адрознымі ад пазіцыі рэдакцыі. Мы будзем працягваць друк мовазнаўчых і гістарычных матэрыялаў у выкладанні тых аўтараў, якіх вы не знойдзеце на старонках іншых выданняў. Кожны нумар “Нашага слова” - гэта далікатны і свежы зрэз сучаснасці і мінуўшчыны, а ў некаторых выпадках спроба заглянуць у будучыню. Мы не стараемся навязваць чытачу сваю думку ці погляды. Мы падаём факты. Чытайце, даведвайцеся, думайце. Будзьце з намі, і вы будзеце з усёй Беларуссю.

**РП - 1**

**Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь**

**АБАНЕМЕНТ** на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

***НАША СЛОВА***
(назва выдання)

Колькасць камплектаў **1**

На 2011 год па месяцах:

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| X | X | X | X | X | X | | | | | | |

**Каму**
(прозвішча, ініцыялы)

**Куды**
(адрас)
(паштовы індэкс)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТАЧКА**

на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

***НАША СЛОВА***
(назва выдання)

| **Кошт** | падпіскі | **16620** руб. | Колькасць камплектаў | **1** |
|---|---|---|---|---|
| | пераадрасоўкі | руб. | | |

На 2011 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| X | X | X | X | X | X | | | | | | |

**Каму**
(прозвішча,ініцыялы)

**Куды**
(адрас)
(паштовы індэкс)